**ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ**
**па правядзенні выбараў**
**у Каардынацыйную Раду III склікання**

# РАШЭННЕ

па скарзе зацікаўленай асобы
на рашэнне Выбарчай камісіі ад 25 красавіка 2024 года
аб выключэнні са спісу кандыдатаў выбарчага суб'екта

29 красавіка 2024 года г. Варашава

Выбарчая камісія па правядзенні выбараў у Каардынацыйную раду III склікання (далей - Выбарчая камісія) ў асобах Алены Прыходзька (старшыні), Андрэя Атаманчука, Яраслава Бекіша, Дзмітрыя Лазавіка, Альвіны Мінгазавай і Алены Філатавай, разгледзіўшы на адкрытым пасяджэнні скаргу на Пастанову Выбарчай камісіі ад 25 красавіка 2024 года "Аб зацвярджэнні спісаў выбарчых суб'ектаў",

## ВЫЗНАЧЫЛА:

27 красавіка 2024 года ў 21:05 (CET) на адрас Выбарчай камісіі паступіла скарга ад заяўніка Надзеі Нортан. Заяўнік просіць унесці змяненне ў спіс кандыдатаў выбарчага суб'екта "Голас дыяспар - Адзінства па над межамі", а менавіта, адлюстраваць імя заяўнік як "Надзея Нортан", прыбраўшы прозвішча згодна з дасланым ідэнтыфікацыйным дакументам.

### Прымальнасць разгляду скаргі:

Скарга пададзена ад зацікаўленай асобы, у дачыненні да якой было прынята рашэнне Выбарчай камісіяй. Дакумент накіраваны на канал афіцыйнай камунікацыі ў вызначаны пп. 16.1 тэрмін, паколькі спіс кандыдатаў быў апублікаваны толькі 26 красавіка 2024 года.

Разам з тым, у парушэнне абавязковых патрабаванняў Рэгламента, а менавіта, пп.16.1 **а)** пункта 16, заяўнік не ўказала сваё імя па-бацьку і кантакт, на каторы накіроўваецца адказ па скарзе. Таксама ў парушэнне пп. 16.1 **б)** пункта 16 не ўказваецца рашэнне, якое абскарджвае заўнік.

Абмеркаваўшы хібы дасланай скаргі, Выбарчая камісія прыйшла да высновы, што ў дадзеным выпадку невыкананне заяўнікам патрабаванняў Рэгламента не з’яўляецца істотным, каб пакінуць скаргу без разгляду. А сам змест скаргі сведчыць пра тое, што абскарджваецца Пастанова ад 25 красавіка 2024 года “Аб зацвярджэнні спісаў выбарчых суб’ектаў”.

**Довады скаргі:**

1. Заяўнік сцвярджае, што адсутнічаў дазвол на публікацыю прозвішча “Сычугова”.
2. Заяўнік сцвярджае, што гэтым прозвішчам не карыстаецца 13 гадоў.
3. Рашэннем камісіі была раскрыта прыватная інфармацыя, пазначэнне якой “з’яўляецца важнай для выбарчай кампаніі, а вось для рэжыма Лукашэнкі можа стаць дадатковым прадметам ціску” для сваякоў заяўніка.

Да скаргі прыкладзены дакумент з акругі Санта Круз (Каліфорнія, ЗША), паводле якога заяўнік пабралася шлюбам і змяніла прозвішча з “Сычуговай” на “Нортан”.

**Разгледзіўшы і абмеркаваўшы довады скаргі, Выбарчая камісія прыходзіць да наступных высноваў:**

1. Камісія не пагаджаецца з довадам заяўніка наконт адсутнасці дазволу на публікацыю імя і прозвішча.

22 красавіка 2024 года ад ініцыятара выбарчага суб’екта “Голас дыяспар - Адзінства па над межамі” Рамана Кісляка паступіла заяўка на рэгістрацыю з прыкладаннем спісу кандыдатаў. У спісе ўтрымліваліся наступныя звесткі пра Вашу асобу:

“1 Надзея Нортан (Сычугова (дзявочае); 5/10/1978”.

У гугл-форме, праз якую дасылалася заяўка, Раман Кісляк дадаткова пацвердзіў правільнасць перададзеных ім звестак.

24 красавіка 2024 года заяўнік запоўніла форму верыфікацыі чальца выбарчага спісу, у якой адзначылі наступнае:

***(імя і прозвішча)*** *- Надзея Нортан, беларускі пашпарт маю на дзявочае прозвішча* <u>*Сычугову*</u>*, маю шлюбны сертыфікат, які падцверджвае змену прозвішча, але ж далучыць да гэтай формы можна толькі адзін файл;*

*“Я ведаю і даю згоду на рэгістрацыю кандыдатам у заяўленым спісе выбарчага суб'екта на выбарах у Каардынацыйную Раду трэцяга склікання пад уліковым нумарам у адпаведнасці з пададзеным ініцыятарам спісам”;*

*“Падпісваючы гэта, я цалкам і добраахвотна пацвярджаю сваю згоду з палажэннямі Мемарандума”.*

Да формы быў прыкладзены скан пашпарту Рэспублікі Беларусь на імя **SYCHUGOVA NADZEYA**.

У Мемарандуме аб прынцыпах і правілах удзелу ў выбарчай кампаніі ў Каардынацыйную раду Беларусі, які заяўнік пагадзілася выконваць, сцвярджаецца пра неабходнасць выконваць правілы “Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду Беларусі” і рашэнні Выбарчай камісіі. У пп 8.3 пункта 8 Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду (далей - Палажэнне) адзначана наступнае: “*Спісы кандыдатаў і выбарчыя праграмы выбарчых суб’ектаў публікуюцца на сайце КР не пазней як за 30 дзён да дня пачатку галасавання*”.

Такім чынам, Выбарчая камісія прыходзіць да высновы, што заяўнік дала згоду на апрацоўку яе анкетных дадзеных (імя і прозвішча), ведаючы, што такія дадзеныя падлягаюць апублікаванню. Зыходзячы з дадзеных, якія паступілі ў Выбарчую камісію, была праведзена верыфікацыя: згодна з пашпартам Рэспублікі Беларусь выяўлена прыналежнасць да беларускага грамадзянства Надзеі Сычуговай. Іншых дакументаў не было прыкладзена, з прычыны чаго Выбарчая камісія адзначыла прозвішча Нортан у якасці прозвішча, якое кандыдат жадае адлюстраваць у спісе.

Універсальны падыход да парадку ўказання дадзеных пра кандыдата ў спісе (ў выпадку несупадзення пададзеных ім звестак з дадзенымі ідэнтыфікацыйнага дакумента) наступны:

- імя (якое кандыдат просіць указаць у выбарчым спісе);
- у дужках - імя, якое кандыдат мае паводле ідэнтыфікацыйнага дакумента на цяперашні час;
- прозвішча (якое кандыдат просіць указаць у выбарчым спісе);
- у дужках - прозвішча (якое кандыдат мае паводле ідэнтыфікацыйнага дакумента на цяперашні час);

Паколькі Выбарчая камісія не выйшла за межы анкетных дадзеных, накіраваных заяўнікам, атрымала ад заяўніка пацвярджэнне правільнасці гэтых дадзеных, вызначыла адпаведнасць імя і прозвішча з указанымі ў ідэнтыфікацыйным дакуменце анкетнымі дадзенымі і, прымаючы да ўвагі згоду заяўніка на выкананне Палажэння аб выбарах (згодна з пп.8.3 каторага спісы кандыдатаў публікуюцца на сайце КР), Камісія прыходзіць да высновы аб неадпавяданні довада заяўніка фактычным абставінам.

2. Камісія лічыць, што довад аб некарыстанні прозвішчам “Сычугова” на працягу 13 гадоў, не мае значэння для рашэння па скарзе.

Пытанні выкарыстання свайго імя і прозвішча адносіцца да сферы асабістых немаёмасных стасункаў, што не мае дачыненне да выбарчага працэсу.

3. Камісія не пагаджаецца з тэзісам пра тое, што апублікаваная інфармацыя (імя і прозвішчы заяўніка) з’яўляюцца прыватнай інфармацыяй.

З моманту ўдзелу ў выбарчым працэсе звесткі кандыдат становіцца публічнай асобай, а звесткі пра яго становяцца даступнымі для шырокага кола грамадзян.

Публічная асоба апрыёры карыстаецца меншым узроўнем абароны ад умяшання ў асабістае, сямейнае жыццё, ад разгалашэння іншай (нават канфідэнцыяльнай) інфармацыі аб ёй. Такі стан рэчаў тлумачыцца роляй і месцам, якое займае вышэйзгаданая асоба ў грамадскім жыцці краіны.

Згодна з пунктам 6 Рэзалюцыі ПАСЕ №1165 (1998) аб праве на недатыкальнасць асабістага жыцця, *“публічныя фігуры павінны прызнаць тую акалічнасць, што асаблівае становішча, якое яны, часта па ўласным выбары, займаюць у грамадстве, аўтаматычна вядзе да ўзмацнення ціску грамадскасці ў дачыненні да іх асабістага жыцця”*.

У адпаведнасці з пунктам 9 *“пэўныя факты з прыватнага жыцця публічных, і, у прыватнасці, палітычных дзеячаў, вядома ж, могуць мець цікавасць для грамадзян і, такім чынам, чытачы, якія таксама з'яўляюцца і выбаршчыкамі, маюць права быць у курсе аб такіх фактах”*.

Такім чынам, Выбарчая камісія не бачыць парушэння ў патрабаванні да палітыка давесці да выбаршчыкаў інфармацыю пра сваё сапраўднае прозвішча.

Што тычыцца довада аб тым, што апублікаваныя звесткі ствараюць пагрозу для сваякоў, Выбарчая камісія адзначае наступнае.

Да моманту апублікавання спісаў кандыдатаў заяўнік не прымаў аніякіх дзеянняў, какіраваных на бяспеку грамадзян: ніякіх просьбаў не ўтрымлівалася ў заяўках кандыдата і ініцыятара выбарчага спісу, не накіроўваліся асобныя лісты з просьбамі на адрас Выбарчай камісіі.

Разам з тым, Выбарчая камісія пагаджаецца, што бяспека грамадзян у выбарчым працэсе з’яляецца безумоўным прыярытэтам. З гэтай прычыны ў адказ на зварот заяўніка ад 26 красавіка 2024 года Выбарчая камісія выклала наступную рэкамендацыю: “для забеспячэння бяспекі Вашых блізкіх Вы ўправе ў дапаведнасці з пп. 7.1 пункта 7 Палажэння звярнуцца ў Выбарчую камісію з просьбай аб выключэнні Вашай кандыдатуры са спісу”.

Такім чынам, Выбарчая камісія лічыць вышэй адзначаны довад заяўніка непераканаўчым.

**На падставе вышэй выкладзенага Выбарчай камісіяй**

**ВЫРАШАНА:**

У здавальненні скаргі ад Надзеі Нортан (Сычуговай), кандыдата №1 выбарчага суб’екта “Голас дыяспар - Адзінства па над межамі” - адмовіць.

Паведаміць заяўніку, што рашэнне Выбарчай камісіі можа быць паўторна абскарджана ў тэрмін 24 гадзіны з моманту яго атрымання.

Выбарчая камісія — А. Прыходзька (старшыня)